Уладзімер Роўда

# ГЕАПАЛІТЫЧНЫЯ ІНТАРЭСЫ РАСІІ Ў БЕЛАРУСІ

Пасьля распаду СССР у Расіі ўзьнікла патрэба ў кампэнсацыі велізарнай псыхалягічнай траўмы, якую атрымалі як усе расійцы, так, у прыватнасьці, і расійскія палітычныя эліты. Страта Закаўказьзя і Цэнтральнай Азіі, адступленьне на захадзе да межаў, існых на пачатку XVII ст., абвастрэньне сацыяльных і эканамічных праблемаў, імклівае пераўтварэньне былой супэрдзяржавы ў краіну "трэцяга сьвету" паставілі Расію перад гістарычным выклікам. Расійскім адказам на гэты выклік стала нарошчваньне кантролю перш-наперш над краінамі СНД. Замацаваны ў расійскай мове выраз "блізкае замежжа" адлюстроўвае пярэдні плян расійскіх геапалітычных прэтэнзіяў. Расія, між іншым, зацікаўленая ў як мага шчыльнейшым кантролі над Беларусяй, таму што:

— праз нашу краіну ідзе 75—80% расійскага транзыту на Захад;

— тэрыторыя Беларусі ёсьць мастом паміж Балтыяй і Ўкраінай, кантроль над якім не дазваляе стварыць антыімпэрскі блёк незалежных дзяржаваў, што ляжаць паміж Балтыйскім і Чорным морамі;

— існуюць магчымасьці беспасярэдняга выхаду расійскіх войскаў на межы з Украінай і краінамі НАТО, разгортваецца дзейнасьць на нашай тэрыторыі расійскіх сыстэмаў супрацьракетнай абароны, а ў пэрспэктыве — вяртаньня ядравай зброі і ракетаў сярэдняга радыюсу дзеяньня;

— тэрыторыя нашай краіны адыгрывае важную ролю ў забесьпячэньні сухапутных сувязяў з Калінінградзкім анклявам Расіі;

— паводле падлікаў расійскіх эканамістаў, эканамічнае паглынаньне Беларусі за 2-3 гады можа забясьпечыць 25 % прыросту расійскай эканомікі. Гл: Н. А. Нартов, *Геополитика.* — М. Юнити, 2002. — С.176—179.

Але просты пералік прычынаў зацікаўленасьці Расіі ў геапалітычным панаваньні на Беларусі нічога ня кажа пра формы і зьмест такога панаваньня. Да таго ж, у сучаснай Расіі існуе шэраг самых розных падыходаў да распрацоўкі сваёй стратэгіі ў дачыненьні да Ўсходняй Эўропы і Беларусі як часткі гэтага рэгіёну.

## Новая расійская нацыянальная ідэнтычнасьць

Геапалітычныя інтарэсы Расіі ў Беларусі немагчыма зразумець і адэкватна прааналізаваць без адказу на пытаньне: чым ёсьць Расія ў сучасным сьвеце, што разумеецца пад паняцьцямі “расійская нацыя”, “расійская дзяржава”, “расійскія нацыянальныя інтарэсы”?

Распад СССР у 1991 г. і ўзьнікненьне на постсавецкай прасторы новых незалежных дзяржаваў паставілі перад гэтымі дзяржавамі пытаньне нацыянальнай ідэнтычнасьці іх грамадзянаў. Найбольш актуальным яно стала акурат для Расіі і расійскага народу, бо калі для элітаў большыні былых саюзных рэспублік было само сабой зразумела, што шлях іхнага далейшага разьвіцьця палягае ўва ўмацаваньні нацыянальнай незалежнасьці і нацыянальнай дзяржаўнасьці, то для Расіі, якая захавала імпэрскі касьцяк, праблема нацыянальнай ідэнтычнасьці і цяпер застаецца надзвычай вострай.

Яшчэ ў 1990 г. Б. Ельцын, выступаючы ў Кіеве, дэкляраваў адмову новай Расіі ад імпэрскага курсу, які не зрабіў народы гэтай краіны багацейшымі і шчасьлівейшымі. Але ўжо ў другой палове 90-х гадоў той жа Ельцын фактычна адмовіўся ад гэтых ідэяў і дэкляраваў у афіцыйным дакумэнце аб палітыцы Расіі ў дачыненьні да СНД, прынятым у верасьні 1995 г., што “галоўным заданьнем такой палітыкі ёсьць стварэньне эканамічна і палітычна інтэграванай супольнасьці дзяржаваў, якая будзе здольнай прэтэндаваць на належнае ёй месца ў сусьветнай супольнасьці… кансалідацыя Расіі ў ролі вядучай сілы ў фармаваньні новай сыстэмы міждзяржаўных палітычных і эканамічных адносінаў на постсаюзнай прасторы”. Для рэалізацыіі палітыкі новага гегеманізму на абшарах былога СССР Масква імкнулася да стварэньня адзінага вайсковага камандаваньня і дасягненьня іншых стратэгічных мэтаў:

— каб узброеныя сілы краінаў СНД былі зьвязаныя афіцыйнымі дамовамі;
— каб “вонкавыя” межы СНД знаходзіліся пад цэнтралізаваным кантролем (чытай: кантролем Масквы);
— каб расійскія войскі адыгрывалі вырашальную ролю ў любых міратворчых апэрацыях унутры СНД;
— каб была сфармуляваная супольная замежнапалітычная дактрына краінаў СНД;
— каб Расія мела магчымасьць ажыцьцяўляць трансьляцыю свайго тэлебачаньня на тэрыторыю ўсёй “садружнасьці” і г.д.

Зь сярэдзіны 90-х гадоў Расія канчаткова ўзяла на ўзбраеньне гегеманісцкі курс у дачыненьні да краінаў “блізкага замежжа” і пабудовы так званай нацыянальнай дзяржавы на падставе расійскай ідэнтычнасьці. Гэты курс працягваецца і пры прэзыдэнту Пуціну, які зрабіў яго адначасова і больш прагматычным, і больш жорсткім.

З. Бжазінскі адзначаў з нагоды падпісаньня саюзнай дамовы 1996 г.: *“Хаця Масква і змагла захаваць палітычна кіруючае становішча ў новай, атрымаўшай афіцыйны статус незалежнасьці, але ў найвышэйшай ступені зрусіфікаванай Беларусі, аднак яшчэ ня ясна, ці не здабудзе ў рэшце рэшт і тут верхавенства нацыяналістычная інфэкцыя… Для Беларусі “Славянскі саюз” без Украіны значыў бы ня што іншае, як уключэньне ў склад Расіі .”* З. Бжезинский. *Великая шахматная доска.* — М. Международные отношения, 1999. – С.114,138.

Прыход да ўлады Пуціна ў Крамлі ў 2000 г. прывёў да істотнага перагляду стратэгіі беларуска-расійскай інтэграцыі, што дазваляе гаварыць аб новым этапе ў яе ажыцьцяўленьні. Масква паспрабавала пазбавіцца ад эканамічна нявыгадных ёй парамэтраў сваіх адносінаў зь Менскам. Акцэнты былі перанесены на эканамічную інтэграцыю, а менавіта на прыватызацыю найбольш выгадных беларускіх прадпрыемстваў расійскім прыватным капіталам. Палітычная інтэграцыя, на думку сучасных расійскіх аналітыкаў, будзе эфэктыўнай толькі пасьля дасягненьня Беларусяй адпаведнага ўзроўню эканамічнай залежнасьці ад капіталістычнай Расіі. Усё радзей і радзей у Маскве гучаць словы пра саюз роўных, братнюю ўзаемадапамогу славянскіх народаў, як гэта было ў другой палове 90-х гадоў.

## Расія як нацыянальная дзяржава?

За гады, якія мінулі пасьля распаду Савецкага Саюзу, узрасла легітымнасьць пераважнай большыні палітычных сыстэмаў краінаў СНД. Нягледзячы на сур’ёзныя эканамічныя і сацыяльна-палітычныя праблемы, зь якімі сутыкнуліся новыя незалежныя дзяржавы, ніводная зь іх (Беларусь тут выглядае як вынятак з агульнага правіла) ня хоча ахвяраваць сваім сувэрэнітэтам на карысьць нейкага новага саюзнага цэнтру. Любая спроба зноў “загнаць іх жалезнай рукой у савецкае шчасьце” непазьбежна прывяла б да паўтарэньня сытуацыі, якая ўжо аднойчы зруйнавала СССР: легітымнасьць рэспубліканскіх уладаў была тады значна вышэйшай за легітымнасьць улады цэнтру.

Але й цяпер, праз дванаццаць гадоў па абвяшчэньні дзяржаўнага сувэрэнітэту Расійскай Федэрацыі, актуальнымі застаюцца пытаньні: а ад каго расійцы сталі незалежнымі? Ці ёсьць РФ нацыянальнай дзяржавай?

Адзін зь вядомых амэрыканскіх спэцыялістаў па Расіі Томас Рэмінгтан падкрэсьлівае, што нацыянальныя эліты іншых саюзных рэспублік ужо ў часы СССР імкнуліся да таго, каб ува ўмовах панаваньня камуністычнай ідэалёгіі разьвіваць нацыянальную самасьвядомасьць сваіх народаў, шырыць нацыянальную культуру. Расійская Фэдэрацыя, у адрозьненьне ад іх, мала што рабіла ў гэтым кірунку. Доўгі час у РСФСР не было ні сваёй Акадэміі навук, ні шмат якіх творчых саюзаў, ні нават сваёй кампартыіі. У сьвядомасьць людзей убіваўся

знак роўнасьці паміж паняцьцямі “Расія” і “СССР” (Гл.: T. Remington, *Politics in Russia* in G. Almond & B. Powell eds. “Comparative Politics Today”. 6-th edition. — N.Y.: Harper Collins, 1996. — P.P. 382 — 383).

Як сьведчыць Рэмінгтан, існуе некалькі фактараў, якія істотным чынам адрозьніваюць нацыянальную спэцыфіку Расійскай Фэдэрацыі ад іншых рэспублік былога СССР.

*“Перадусім дэмаграфічны чыньнік. Насельніцтва Саюзу было ў значна большай ступені фрагмэнтаванае этнічна, чымся гэта ўласьціва для Расіі. Прыблізна палову насельніцтва былога СССР складалі этнічныя расійцы, астатняе насельніцтва адносілася да розных іншых нацыянальных групаў. Насельніцтва* Расійскай Фэдэрацыі *на 80% складаецца з расійцаў. На ейныя нацыянальныя меншасьці прыпадае вельмі малая доля ад цэлага. Акрамя таго, савецкі народ ніколі не ўяўляў сабой нейкага асобнага этнасу, у той час як расійская нацыянальная культура рэпрэзэнтуе пэўную гістарычную ідэнтычнасьць, у якую асымілююцца іншыя нацыянальныя групы — самахоць, а часам і сілком. Нарэшце, усе нацыянальныя рэспублікі Савецкага Саюзу разьмяшчаліся па пэрымэтры краіны і межавалі зь іншымі дзяржавамі. Бальшыня расійскіх нацыянальна-этнічных тэрыторыяў знаходзіцца ўнутры расійскай тэрыторыі й з гэтай прычыны ня мае простага кантакту з вонкавым сьветам”.* T. Remington, *Politics in Russia. —* P. 395.

На думку Рэмінгтана, дадзеныя чыннікі спынілі працэс распаду Савецкай імпэрыі межамі Расійскай Фэдэрацыі. Але іхная трываласьць ёсьць адноснай, залежнай як ад аб’ектыўных дэмаграфічных працэсаў у Расіі, так і ад суб’ектыўных фактараў: палітычнага курсу фэдэральнага цэнтру і нацыянальных рэспублік.

У сучаснай Расіі існуе шэраг падыходаў да адказу на гэтыя пытаньні, якія, на добры лад, можна зьвесьці да пяці канцэпцыяў-праектаў. Дзьве зь іх накіраваныя на пабудову нацыянальнай дзяржавы, тры — на аднаўленьне імпэрыі:

— Пабудова *расійскай нацыянальнай дзяржавы* шляхам інтэнсіўнай асыміляцыі нерасійскіх народаў, узбуйненьня адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, абмежаванай вонкавай экспансіі.

— Пабудова *расійскай нацыянальнай дзяржавы* ў межах тых тэрыторыяў, дзе пераважаюць этнічныя расійцы (праект “Рэспубліка Русь”), адмова ад вонкавай экспансіі, стварэньне канфэдэрацыйнага аб’яднаньня рэспублік сучаснай Расійскай Фэдэрацыі.

— *Рэстаўрацыя СССР* у поўным альбо частковым выглядзе, дзе Расія будзе займаць дамінуючае месца, вонкавая экспансія, вялікадзяржаўнасьць.

— Рэстаўрацыя Расійскай імпэрыі, якая існавала да першай сусьветнай вайны, у поўным альбо частковым выглядзе альбо стварэньне Саюзу Славянскіх Рэспублік (*панславісцкі праект*); вонкавая экспансія, вялікадзяржаўнасьць.





— Пабудова новай Расійскай імпэрыі (*эўразійскі праект*); улучэньне нерасійскіх народаў у якасьці малодшых партнэраў велікаросаў у імпэрабудаўніцтва; глябальная вонкавая экспансія; дасягненьне статусу звышдзяржавы за любы кошт, у прыватнасьці дзякуючы палітыцы ядравага шантажу.

Кожны з гэтых праектаў па-своему канструюе пэрспэктыву стасункаў паміж Расіяй і Беларусяй і таму заслугоўвае пільнай увагі.

Другі, трэці і чацьверты праекты зь пералічаных вышэй ёсьць малапэрспэктыўнымі і займаюць маргінальнае месца сярод праграмаў, якія ўсур’ёз абмяркоўваюцца палітычнай і інтэлектуальнай элітай сучаснай Расіі. Найбольшай падтрымкай расійскіх элітаў цешацца канцэпцыі (1) пабудовы нацыянальнай дзяржавы шляхам інтэнсіўнай асыміляцыі нерасійскіх народаў і (2) будаўніцтва эўразійскай імпэрыі, якія мы паспрабуем прааналізаваць праз прызму геапалітычных інтарэсаў Расіі ў Беларусі.

## Беларусь і беларусы ў мысьленьні сучасных расійскіх геастратэгаў

Якое ж месца ў эўразійскім праекце належыць беларусам? Адзін з найбольш вядомых расійскіх геастратэгаў А. Дугін піша:*“У дачыненьні да Беларусі геапалітычная карціна даволі ясная. За выключэньнем невялікай часткі палянізаваных беларусаў (каталікаў ды ўніятаў, а таксама палякаў), пераважная большасьць насельніцтва адназначна належыць да расійскай прасторы і павінна разглядацца як* ***суб’ект цэнтральнага эўразійскага этнасу, г.зн. як “расійцы”*** *ў культурным, рэлігійным, этнічным і геапалітычным сэнсах. Моўная спэцыфіка, некаторыя этнічныя ды культурныя асаблівасьці ня мяняюць агульнай карціны. Таму зь Беларусяй Масква павінна інтэгравацца найшчыльней, не забываючыся пры гэтым аб тым, што заахвочваньне культурнай ды моўнай самабытнасьці беларусаў зьяўляецца важным пазытыўным момантам ува ўсёй сыстэме эўразійскай інтэграцыі. У адносінах з этнасамі, прыналежнымі да адной дзяржавы, гэты прынцып трэба выконваць так сама строга, як і ў адносінах з памежнымі народамі ці суседзямі.”* А. Дугин, *Внутренняя геополитика России* // Дугин А. “Основы геополитики”. — М. “АРКТОГЕЯ-центр”, 1999.— С. 168.

Што да пытаньня пра месца Беларусі ў геапалітычных плянах расійскіх нэаэўразійцаў, Дугін адзначае: *“Адзіны балючы крок у Беларусі, які неабходна зрабіць для папярэджаньня цэнтрабежных і падрыўных тэндэнцыяў, гэта вылучэньне ў асобную адміністрацыйную катэгорыю некаторых абласьцей, кампактна заселеных каталікамі ды ўніятамі, аж да наданьня ім істотнай аўтаноміі, дастатковай для таго, каб увайсьці ў Сярэднеэўрапейскую прастору. Імкненьне любым коштам утрымаць Беларусь усю цалкам пад прамым ды жорсткім кантролем Масквы прывядзе да таго, што і ў ёй самой, і з боку заходніх суседзяў Расіі будзе тлеючае вугольле патэнцыйнага*

*геапалітычнага канфлікту, які ў гэтым выпадку (у адрозьненьне, напрыклад, ад Літвы) можа быць вырашаны на карысьць усіх зацікаўленых бакоў. Беларусь варта разглядаць як частку Расіі, і таму інтэграцыю зь ёю трэба праводзіць па восі Захад–Усход, якая зьяўляецца прыярытэтнай ува ўсіх выпадках унутранай арганізацыі этнічна аднароднай прасторы. Сучасная заходняя мяжа Расіі павінна праходзіць значна далей на захад, таму ў паўнавартаснай геапалітычнай карціне беларускія землі хутчэй належаць да цэнтральнай вобласьці, чым да заходняй ускраіны".* (С. 377—379.)

Як кажуць, традыцыя ёсьць традыцыя, і ад яе нікуды не падзенешся. Колькі разоў ні дзялілі Беларусь крамлёўскія кіраўнікі ў XX ст., нэаэўразійскія стратэгі прапануюць паўтарыць той жа сцэнар і ў XXI ст. Як бачым, не дапамагае нам ні шчырая адданасьць старэйшаму брату, ні клятвы Лукашэнкі перад выбарамі 2001 "пераўтварыць Беларусь у суцэльную Брэсцкую крэпасьць", якая абароніць Маскву ад НАТО. Больш далікатным варыянтам інкарпарацыі Беларусі ў склад Расіі выглядае выкладзены ў зборніку "Наш путь": *"Мінімальным маштабам эўразійскай інтэграцыі, альбо ейным першым этапам павінна стаць стратэгічнае ўзьяднаньне краінаў СНД (былых савецкіх рэспублік) у адзіную геапалітычную канструкцыю, аб'яднаную ўсьведамленьнем адзінства геапалітычных інтарэсаў і еднасьці стратэгічнага і цывілізацыйнага лёсу... Геапалітычнае аб'яднаньне СНД (магчымае на першым этапе за выключэньнем тых дзяржаваў, якія вельмі глыбока ўцягнуліся ў атлянтычныя мэханізмы) павінна ўсьведамляцца як выкананьне эўразійскай прадвызначанасьці, а не свавольства адной палітычнай ці ідэалягічнай групоўкі".* Наш путь. Стратегические перспективы развития России в XXI веке. — С. 98.

Такім чынам, эўразійскі сцэнар для разьвіцьця Расіі ў XXI ст. зьяўляецца нічым не прыхаванай праграмай глябальнага экспансіянізму, па-ранейшаму уласьцівага сьветапогляду значнай часткі сучаснай палітычнай, эканамічнай ды вайсковай эліты Расіі. Адбудова імпэрыі ёсьць адным з найбольш верагодных шляхоў разьвіцьця Расіі з-за таго, што яна практычна ня ведала іншых.

* * *

На нашую думку, з аналізу геапалітычных інтарэсаў Расіі ў Беларусі можна зрабіць дзьве галоўныя высновы.

Па-першае, абарона нацыянальных інтарэсаў Беларусі немагчымая пры ізаляцыі нашай краіны, і таму неабходна імкнуцца да як мага больш шчыльнага супрацоўніцтва з тымі краінамі, якія апынуліся, як і мы, у складаным геапалітычным становішчы і якія не нясуць пагрозы нашаму сувэрэнітэту.

Па-другое, інкарпарацыя Беларусі ў склад Расіі, калі яна адбудзецца, стане толькі першым крокам на шляху глябальнай экспансіі гэтай дзяржавы, першай цаглінай у муры новай псэўдадэмакратычнай імпэрыі. Таму ня толькі сувэрэнітэт краінаў Балтыі ды Ўкраіны павінен хваляваць дальнабачных эўрапейскіх і амэрыканскіх палітыкаў.